*Любая Алёна Аляксандраўна*
*прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, кандыдат гістарычных навук*

## Інстытуты татарскага самакіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім XV–XVIII ст.

Першая і галоўная праблема пры вывучэнні інстытутаў і механізмаў самакіравання татараў Вялікага Княства Літоўскага – поўная адсутнасць аўтэнтычных крыніц, якія б стварылі самі татары. Другая праблема непарыўна звязаная з першай і тлумачыцца выключнай абмежаванасцю інфармацыі, прыдатнай для навуковага аналізу. Трэцяя праблема звязаная з феноменам “складанасці перакладу”, які добра вядомы сацыякультурнай антрапалогіі. Таму вельмі складана зразумець, што меў на ўвазе канкрэтны ашмянскі, мінскі або віленскі пісар, абапіраючыся на ўласны культурны вопыт, логіку і веды, калі у XVI–XVII стагоддзі пісаў “маршалак татарскі”, “дом папоў татарскіх”, “дзяк татарскі” або “мінскі татарскім магістрат”.Па сваім сацыяльным прызначэнні ўсе інстытуты татарскага самакіравання можна падзяліць на некалькі катэгорый: рэлігійныя, грамацкія і вайсковыя.

*Рэлігійныя інстытуты: мална і кадзі.*

Жыццём рэлігійнай мусульманскай супольнасці ў Вялікім Княстве Літоўскім, у адпаведнасці з нормамі шарыяту, кіраваў імам або мална, як гэты інстытут фіксуюць крыніцы Вялікага Княства Літоўскага. Першы з мясцовых імамаў, згадка пра якога захавалася ў Метрыцы Вялікага Княства Літоўскага, меў імя Ібрагім Цімірчыч Юшынскі [0, С. 153–184]. Ён быў надзвычай разнастайнай асобай – дыпламат, талмач, пісар татарскі, харунжы і маршалак Юшышскай харугвы з Трокаў.

Звычайна імам выбіраўся рэлігійнай грамадой сярод кандыдатаў, якія добра ведаюць рэлігійныя традыцыі і Каран, а таксама маюць рэпутацыю набожнага чалавека [0, S. 86–87]. Але некаторыя крыніцы сведчаць, што працэс выбару малны не заўжды быў просты. Паточная кніга Віленскага гродскага суда за 1628 год утрымлівае паўторную скаргу братоў Махмета і Мустафы Нурсеітовічаў на іншых татараў мястэчка Рудаміна. У тым ліку позва была складзена на Меляша Мухніча, абранага грамадою ў якасці малны насуперак склаўшайся мясцовай традыцыі выбіраць імама па чарзе з двух сем’яў, якія мелі дачыненне да ўзвядзення мяцэці ў Рудаміне. А таксама на яго памочніка – муэдзіна Алея Шахдавлетавіча [0, Арк. 157–158].

Традыцыйна быт імама забяспечваўся мусульманскай супольнасцю. У згаданай спрэчцы вакол рудамінскай мячэці адной з галоўных прычын выступала якраз фінансавая. Выявіць памер фінансавага забеспячэння малны ў акрэслены перыяд вельмі складана праз адсутнасць сістэмных звестак. Але, напрыклад, у канцы XVIII стагоддзя у Наваградскай джаміі мална меў дастаткова высокі прыбытак з мячэці. Фрагментарна захаваная метрычная кніга з Наваградскай мячэці. Яна дазваляе зрабіць выснову, што мясцовы мална ў эканамічным плане жыў на шмат лепей чым яго калегі з уніяцкіх прыходаў [0, Арк. 1–13].

З улікам спрэчкі аб Рудамінскай мячэці, а таксама некаторых больш позніх выпадках (малны з роду Лебядзёў у Наваградку, Даўбуцішках і на Валыні ў канцы XVIII стагоддзя, малны Канапацкія ў Смілавічах, малны Шункевічы у Міры і Ляхавічах ў другой палове XIX стагоддзя) можна зрабіць выснову, што рэлігійныя веды з’яўляліся своеасаблівым культурным капіталам, які акумуліраваўся некаторымі сем’ямі і трансфармаваўся ў сацыяльны капітал.

Яшчэ адным важным механізмам самакіравання ў рэлігійнай сферы з'яўляўся рэлігійны суд, больш вядомы як шарыяцкі суд. Татары Вялікага Княства Літоўскага адносіліся да ханафіцкага мазгабу. Інакш кажучы да самай распаўсюджаная сярод сунітаў кананічнай прававой школы. Першыя зафіксаваныя у крыніцах згадкі пра існаванне шарыяцкага суда ў межах дзяржавы адносяцца да 20-х гадоў XVI стагоддзя.

У 1524 годзе перад вялікім князем разглядалася справа пра апеку над дочкамі талмача Легуша бен Хаджы-бея Юшынскага і шлюб старэйшай з іх, Айшы, няўзгодненага з апекунамі. У выпадку з Айшой Легушоўнай нормы ісламскага права супярэчылі прававым традыцыям Вялікага Княства Літоўскага. Закон забараняў выдаваць дзяўчыну замуж без яе згоды [0, С. 92–93]. Але адназначна можна сцвярджаць што, на момант разгляду справы шарыяцкі суд у Вялікім Княстве Літоўскім існаваў і функцыянаваў ў сферы сямейна-шлюбнага права і яго рашэнні верыфікаваліся судовымі органамі Вялікага Княства Літоўскага. Рэлігійны суд мусіў узначальваць кадзі – мусульманскі суддзя. Але крыніцы захавалі згадку толькі пра адну асобу, якая карысталася такім званнем – Дэрвіша Чэлебі Хаджы Мурзіча з Даўбуцішак. У 1586 годзе ён атрымаў прывілей "на кадышства – гэта значыць духоўнае старшынства над усімі татарамі Вялікага Княства Літоўскага" [0, S. 89–91]. Рэдкія згадкі духоўнага мусульманскага суда тлумачацца і тым, што не хапала асобаў, якія б мелі дастатковую кваліфікацыю, каб выконваць функцыі кадзі. Таму ў XVII і XVIII стагоддзях для вырашэння спрэчак у сферы духоўнага права татары Вялікага Княства Літоўскага звярталіся да муфціяў Асманскай імперыі [0, S. 91].

*Грамадскія інстытуты: возны татарскі, маршалак татарскі і мінскі татарскі магістрат.*

Інстытут татарскіх возных – цікавая культурна-правая з’ява. Першы Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529 года абмяжоўваў татараў у праве быць сведкамі ў судовых справах супраць хрысціян. У 1561 годзе гэтая норма была адменена. Але нанова ўведзена паводле Статута 1566 года. Татарам забаранялася сведчыць ва ўсіх справах адносна нерухомасці. Аднак гэтыя норма зноў была адменена ў 1568 годзе. Разам з тым, у адпаведнасці з рэформай судовай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага ў 1564–1566 гадоў татары падлягалі кампетэнцыям земскіх і гродскіх судоў, а ў справах межаў – яшчэ і падкаморскім [0, S. 93–94].

Магчыма, што пасада татарскага вознага была спробай вырашыць праблему прысягі татараў у судах. На дадзены момант вядома, што такая пасада існавала у Гродзенскім земскім судзе ў другой палове XVI стагоддзя. У першыню татарскі возны Кулзіман Аразовіч згадваецца ў Актавай кнізе № 4 Гродзенскага земскага суда (кастрычнік 1568 – 1570 год) [0, Арк. 416 адв. – 419].

Пад скаргай татарына Кадыша Міхновіча на татарына Кадыша Ілясевіча змешчана яго “сазнаніе” пра агляд пацярпелага. Неабходна звярнуць увагу на той факт, што пасада татарскага вознага з’яўляецца ў дадзеным выпадку пасля адмены нормы Статута 1566 года, якая забараняла татарам сведчыць у судах. Свае абавязкі Кулзіман Аразовіч выконваў некалькі дзесяцігоддзяў. У кастрычніку 1597 года ён уводзіў ва ўладанне пляцам зямлі татарскага князя Сувіндука Сакаловіча, пасля продажу маёмасці татарскай княгіняй Шахзадой Абрагімаўнай [0, Арк. 415 – 416 адв]. За пару дзён да гэтага, 22 кастрычніка 1597 года, ён склаў квіт пра перадачу ва ўладанне ласоснінскім татарскім атаманам Айсой Мурзічам і яго братам Фурсам татарыну Ахмецю Бузанавічу пляца зямлі ў маёнтку Ласасенскі [0, Арк. 457–458]. А 12 чэрвеня 1600 года ён жа выдаў квіт па справе перадачы ва ўладанне князем Муртазою Богушавічам пляца

зямлі Андрэю Гнявінскаму [0, Арк. 640 адв. – 641]. Як бачым, функцыі татарскага вознага у Гродзенскім земскім судзе нічым не адрозніваліся ад функцый астатніх возных ў справах датычных шляхты. Больш за тое, іншыя возныя афармлялі дамовы паміж татарамі, а таксама паміж татарамі і шляхтай.

Сам татарскі возны Кулзіман Аразовіч колькакроць трапляў на старонкі судовых кніг ды іншых гаспадарчых крыніц у якасці прадаўца. У 1591–1592 гадах ён прадаў пляц зямлі ў маёнтку Падбагонскі на рацэ Свецца князю Сатылгану Епашэвічу [0, Арк. 563 – 564 адв.], а ў 1585–1586 гадах ён па частках прадаў дуброву на рацэ Ласосна татарскаму князю Юнусу Муртозічу [0, Арк. 68–72]. Ён меў пэўныя сацыяльныя сувязі і з мясцовымі рэгіянальнымі элітамі. Згодна са звесткамі Рэвізіі татарскіх уладанняў, праведзенай цівуном віленскім і лоўчым літоўскім князем Мацвеем Агінскім у 1559 годзе, згаданы вышэй пан Андрэй Гнявінскі, які ўжо пасля гэтых падзей, у 1580–1581 гадах, быў гродзенскім гродскім пісарам [0, S. 282], купіў у Кулзімана Аразовіча і яго жонкі шмат зямлі ў вёсцы Ласосна за 10 коп грошаў [0, Арк. 153 адв.]. Такім чынам, можна меркаваць, што кола сацыяльных кантактаў князя Кулзімана Аразовіча, як сярод мясцовай шляхты, так і сярод гродзенскіх татараў, дазваляла яму эфектыўна выконваць функцыі судовага пасярэдніка ў прыватна-прававых справах.

Аналізуючы статус татараў у судовай сістэме Вялікага Княства Літоўскага нельга ўзгадаць пра натарыяльную ролю імамаў, а менавіта завярэнне судовай прысягі, якую татары мусілі рабіць на Каране [0, С. 53]. Аб працэдуры прынясення мусульманскай прысягі ў Вялікім Княстве Літоўскім вядома не шмат, у асноўным па дыпламатычных крыніцах. Пытанне, наколькі прысяга паслоў Крымскага ханства адпавядала прысязе “сваіх” татараў у судах рознай інстанцыі, дагэтуль застаецца адкрытым.

Крыху святла на гэтую справу пралівае судовая спрэчка паміж гаспадарскімі татарамі Габелям і Аўсеінам Рамаданавічамі, з аднаго боку, і Арызам Юнушкавічам, з другога боку, аб праве ўладання над невольным чэлядзінам, якую 28 жніўня 1559 году разбіраў віленскі суддзя Павал Каспаравіч Аставіцкі. Каб даказаць уласную правату Арызам Юнушкавіч мусіў даць судовую прысягу ў "царкве татарскай" у Даўбуцішках у прысутнасці судовага віжа, аб чым віж меўся скласці справаздачу перад суддзёю. На ўсю працэдуру прысягі давалася чатыры тыдні. Такім чынам, мална, які прымаў прысягу, з'яўляўся часткай судовай працэдуры для татараў Вялікага Княства Літоўскага, а возны татарскі, абазнаны ў мусульманскіх рэлігійных традыцыях, мог паўнавартасна і асэнсавана прадстаўляць дзяржаву пры прынясенні прысягі [0, Арк. 772 адв. – 773].

Пра татарскае самакіраванне ў гарадах амаль нічога не вядома. Адзіная згадка пра падобны інстытут, вядомая на сённяшні момант, адносіцца да горада Мінска. У 1645 годзе мінскія мяшчане скардзіліся ў Мінскі гродскі суд на "татарочны магістрат", які чыніў бяспраўнасць усяму гарадскому насельніцтву, у прыватнасці запячатваў крамы "ўбогіх людзей" [0, Арк. 1165–1166]. Фактычна, гэтая справа ніяк не раскрывае функцыі і мэты "татарскага магістрату", акрамя таго, што паведамляе пра яго існаванне і не простыя адносіны з нейкай часткай мінскіх мяшчан. Беларускі гісторык Дзяніс Лісейчыкаў выказаў меркаванне, што па сваім прызначэнні татарскі магістрат у Мінску мог набліжацца да армянскіх органаў самакіравання ў Замосці, Львове і Камянцы.

У 1585 годзе Ян Замойскі, які ўзяўся за амбітную справу – рэалізацыю канцэпцыі ідэальнага горада, запрасіў армян у Замосць і выдаў для іх адмысловы прывілей. Армяне, як дыяспарная нацыя, былі вельмі рухомымі і мелі шырокія гандлёвыя сувязі як з Усходам, так і з Захадам. Неўзабаве, менавіта армяне сталі галоўным чыннікам паспяховага

эканамічнага развіцця горада. Яны гандлявалі віном, ўсходнімі тканінамі, сукном, зброяй, скурамі, футрам, турэцкімі канямі, валамі і нават нявольнікамі. Але адметнасць і звычаяў і веры вымагала іх гуртавацца ў асобныя супольнасцямі, жыццё якіх рэгулявалася асобным правам, якое абапіралася на армянскі статут 1519 года, зацверджаны каралём Жыгімонтам Старым. Прывілей Яна Замойскага 1585 года рабіў армянаў цалкам незалежнымі ад гарадскіх уладаў, пры гэтым надаваў ім усе вольнасці і правы, якімі карысталіся іншыя замойскія мяшчане, і, у тым ліку, даваў права выбары ўласнай войтаўска-лаўніцкай структуры і ўласны суд [0, S. 63–82].

Магчыма, что падобны орган самакіравання для татараў існаваў у Мінску. Але цяжка нават сказаць, ці існаваў ён у прыватнай юрыдыцы або на пляцах, якія падлягалі юрысдыкцыі Мінскага магістрата. Вядома, што ў пачатку XVI стагоддзя першая мячэць у Мінску ўзнікла менавіта ў прыватнай юрыдыцы.

Яшчэ адным інстытутам-медыятарам, які павінен быў забяспечваць сувязь паміж татарскай супольнасцю і дзяржаўнымі органамі ў грамадскай сферы быў інстытут татарскіх маршалкаў. Ён параўнальна часта сустракаецца на старонках крыніц. Польскім даследчыкам Пятром Бараўскім нават быў складзены рэестр татарскіх маршалкаў па харугвах [0, S. 397–401]. Аднак канвенцыянальнае меркаванне адносна яго сутнасці дагэтуль не выпрацавана.

Польскі даследчык міжваеннага часу Станіслаў Крычыньскі, які вывучаў гісторыю татараў Вялікага Княства Літоўскага, лічыў, што гэты урад меў ганаровы і рэпрэзентатыўны характар, хоць і дапускаў, што ў некаторых выпадках маршалкі маглі выконваць абавязкі суддзяў [0, S. 65–66]. Пётр Бараўскі, абапіраючыся на прывілей для татарскага князя Ашахума Ахмецэвіча Мурзы ад 1652 года, прыйшоў да высновы, што

кампетэнцыі маршалкаў і харунжых шмат у якіх аспектах былі падобнымі. Такое ўражанне можа скласціся з-за таго, што вельмі часта ў XVI стагоддзі ў межах адной харугвы абедзве пасады займала адна асоба [0, S. 236]. Але так было не заўжды. Ды і сам Пётр Бараўскі адзначае, што некаторыя крыніцы ўказваюць на судовую функцыю урада татарскіх маршалкаў: у хроніцы Мацея Мехавіта князь і маршалак татарскі Абрагім Юшынскі згадваецца ў 1521 годзе як суддзя і пісар, а ў 1516 годзе Цемеш Уразовіч, маршалак харугвы татарскай, называецца суддзёю палюбоўным [0, S. 236]. Можна меркаваць, што яны выконвалі таксама і адміністратыўныя функцыі. Напрыклад, згаданы вышэй князь Абрагім Юшынскі па загадзе вялікага князя мусіў увесці ва ўладанне зямельным маёнткам аднаго з татарскіх царэвічаў. Такую працэдуру пасля камерцыйных угод наконт нерухомасці з другой паловы XVI стагоддзя звычайна праводзілі возныя земскіх судоў. Такім чынам, можна меркаваць, што маршалкі займаліся адміністрацыйнымі, судовымі і грамадзянскімі справамі ў межах вайсковай рода-племяной структуры татарскай супольнасці Вялікага Княства Літоўскага.

Бадай самым даследаваным інстытутам татарскага самакіравання з'яўляецца ўрад татарскіх харунжых. Унутры кожнай харугвы ўрад харунжага перадаваўся па спадчыне звычайна у межах тытульнага княскага роду (Юшынскіх у Троцкай юшынскай харугве; Уланаў, а затым Байрынскіх у Наваградскай Байрынскай харугве; Уланаў Асанчуковічаў ў Гродзенскай уланскай харугве і г.д.). Аднак на гэта патрабаваўся асобны прывілей вялікага князя, яму ж належала безапеляцыйнае рашэнне ў выпадку спрэчных сітуацый. Такая падвойная інвестытура з'яўлялася вынікам дастасавання стэпавых вайскова-палітычных традыцый з прававымі рэаліямі Вялікага Княства Літоўскага. Пачаткова ўланы, мурзы і царэвічы прыбывалі ў Вялікае Княства Літоўскае ў суправаджэнні

большых або меншых ордаў або вайсковых атрадаў, дзе іх улада не была абмежаваная. Потым, татары пачалі атрымоўваць маёнткі ад вялікага князя за вайсковую службу, адначасова захоўваючы першапачатковую родавую структуру в вайсковых адзінках – татарскіх харугваў, якія ўзначальваў, у большасці выпадкаў, нашчадак першага ўлана або мурзы. З гэтага вынікаюць і кампетэнцыі татарскіх харунжых «ся радити и справовати» ў сваіх харугвах.

**Літаратура**.

1. *Любая, А.А. Князь Ибрагим бен Тимер из рода князей Юшинских / А.А. Любая // ALBA RUSCIA: белорусские земли на перекрестке культур и цивилизаций (X–XVI вв.). Серия Исторические исследования. – Москва: Квадрига, 2015. – С. 153–184.*
2. *Konopacki, A. Życie religijne Tatarów na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI–XIX w. – Warszawa: WUW, 2010. – 253 s.*
3. *Скарга татараў Махмета і Мустафы Нурсетевічаў на татараў мястэчка Рудаміна. 1628 год. // LVIA. – F. 21 (Vilniaus pilies teismas = Віленскі гродскі суд). – Ap. 2. – S. 426. – P. 157–158.*
4. *Teka dla zapisania tak rzeczy parafialnych jako y innych dla lepszey pamięci sparządzienniz Roku 1788. // НГАБ. – Ф. 1774. – Воп. 1. – Спр. 155. – 49 арк.*
5. *Lietuvos Metrika (1522-1530) : 4-oji teismų bylų knyga : (XVI a. pabaigos kopija) / [spaudai parengė tekstus: Stanislovas Lazutka et al.] ; Vilniaus universitetas. – Vilnius : Vilniaus universiteto leidykla, 1997. – CXLVII, [3], 512, [2] s.*
6. *Sobczak, Jacek M. Położenie prawne ludności tatarskiej w Wielkim Księstwie Litewskim. – Warszawa–Poznań: PWN, 1984. – 133 s.*

7. *Паказанні татарскага вознага Кульзімана Аразовіча пра агляд пацярпелага. // НГАБ. – Ф. 1755 (Гродзенскі земскі суд). – Воп. 1. – Спр. 4. –Арк. 416 адв. – 419.*
8. *Ліст вознага татарскага Кульзімана Аразовіча пра перадачу ва ўладанне кн. Шагзадай Абрагімаўнай кн. Сувіндуку Сакаловічу пляца зямлі ў татарскім с. Ласасенскае. // НГАБ. – Ф. 1755 (Гродзенскі земскі суд). – Воп. 1. – Спр. 15. – Арк. 415 адв. – 416.*
9. *Квіт татарскага вознага Кулзымана Аразовіча пра перадачу ва ўладанне ласасенскім татарскім атаманам Айсой Мурзічам і братам яго Фурсам татарыну Ахмецю Бузуновічу пляца зямлі ў маёнтку Ласасенскі. // НГАБ. – Ф. 1755 (Гродзенскі земскі суд). – Воп. 1. – Спр. 15. – Арк. 457–458.*
10. *Квіт вознага Кулзімана Аразовіча па справе аб перадачы ва ўладанне кн. Муртазам Богушавічам зямяніну Андрэю Гнявінскаму пляцаў зямлі // НГАБ. – Ф. 1755 (Гродзенскі земскі суд). – Воп. 1. – Спр. 16. – Арк. 640 адв. – 641.*
11. *Ліст вознага татарскага Кулзімана Аразовіча кн. Салтыгану Епашэвічу на прожаж зямлі ў маёнтку Падбагонскі на р. Свеціца. // НГАБ. – Ф. 1755 (Гродзенскі земскі суд). – Воп. 1. – Спр. 11. – Арк. 563 – 564 адв.*
12. *Ліст татарына Кулзімана Аразовіча кн. Юнусу Муртазічу на продаж дубровы на р. Ласосна. // НГАБ. – Ф. 1755 (Гродзенскі земскі суд). – Воп. 1. – Спр. 10. – Арк. 68 – 72.*
13. *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy: t. 2: Województwo trockie XIV–XVIII wiek / red. A. Rachuba. – Warszawa: Wydawnictwo DiG, 2009. – 688 s.*

*14. Рэвізія татарскіх маёнткаў 1631 года. // НГАБ. – Ф. КМФ-18 (Метрыка Вялікага Княства Літоўскага). – Воп. 1. – Спр. 569. – 956 арк.*

*15. Любая, А. А. Коран в дипломатической практике Канцелярии Великого княжества Литовского // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2018. – № 1. – С. 51–58.*

*16. Ліст судовый татарм Рамадановічам з Абызам Юнушкавічам пра парабка іх невольнага Ярміна // НГАБ. – Ф. КМФ-18 (Метрыка Вялікага Княства Літоўскага). – Воп. 1. – Спр. 40 – Арк. 772 адв – 773.*

*17. Скарга мінскіх мяшчан на "татарочны магістрат", які чыніў бяспраўе усяму гарадскому насельніцтву. // НГАБ. – Ф. 1727 (Менскі гродскі суд). – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 1165–1166.*

*18. Zakrzewska-Dubasowa, Mirosława. Organizacja gminy ormiańskiej w Zamościu w XVI–XVII wieku // Rocznik Lubelski. – 1960. – № 3. – S. 63–82.*

*19. Borawski, Piotr. Ziemska służba wojskowa Tatarów Wielkiego Księstwa Litewskiego w XV–XVII wieku. Zabrze–Tarnowskie Góry: Wydawnictwo: INFORTeditions, 2015. – 431 s.*

*20. Kryczyński, Stanisław. Tatarzy litewscy. – Warszawa: Wydanie Rady Centralnej Związku Kulturalno-Oświatowego Tatarów Rzeczypospolitej Polskiej, 1938. – 330 s.*